# ПОЛЫМЯ

КРАСАВІК

1978

# ПОЛЫМЯ

ШТОМЕСЯЧНЫ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ
І ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ ЧАСОПІС
ОРГАН САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Заснаваны ў 1922 годзе

4

(588)

1978

КРАСАВІК


## ЗМЕСТ


Л. І. БРЭЖНЕЎ. Малая зямля . . . . . . . . . 3
ВАСІЛЬ ХОМЧАНКА. Вяртанне ў агонь. Раман . . . . 35
СЯРГЕЙ ГРАХОЎСКІ. Заўсёды ў сэрцы. ***У той далёкай маладосці... Багі. Пасля грому. Шлюб. Прадвесне. Колішнія рынкі. Дзік. Пад яварам. Туман. Павінен любіць. Радасны плач. Позняя размова. Пакутнік. ***Я пазычаць калісьці бегаў жар... Вершы . . . 101
РЫГОР БАРАДУЛІН. З грэкаў у варагі. Вершы . . . . 110
ВАСІЛЬ ГІГЕВІЧ. Райка. Апавяданне. . . . . . . . 138
МІКОЛА МЯТЛІЦКІ. Хвоі. Аўтограф. ***Святло бяроз... Вершы . . . . . . . . . . . . . . . 164

### НОВЫЯ ПЕРАКЛАДЫ

ФРЫДРЫХ ШЫЛЕР. Гера і Леандр. . . . . . . . . 166

### ПУБЛІЦЫСТЫКА

ВАРЛЕН БАРКАН. Праўда аб рэлігіі . . . . . . . . 172

### НАВУКА

АЛЯКСАНДР МАХНАЧ. Пошукі і здзяйсненні вучоных . . 184

### КРЫТЫКА І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

ВЯЧАСЛАЎ ІВАШЧАНКА. Чалавек на вайне і дома . . . 198
ВАЛЯНЦІНА КОЎТУН. «Ой, за гаем, гаем зеляненькім...» . 214



Минск, издательство «Полымя»

## УСПАМІНЫ, ДЗЁННІКІ, ДАКУМЕНТЫ

АРСЕНЬ ЛІС. След пякучай маланкі . . . . . . . . 230

## СЯРОД КНІГ

МІКОЛА ФІЛІМОНАЎ. Па дарогах мужнасці і гераізму. . 245
МАРЫНА БАРСТОК. Дарагая мая матуля. . . . . . . 249
ВАЛЯНЦІНА ЛОКУН. Паводле строгіх законаў. . . . . 252
АНТОН БЯЛЕВІЧ. Задушэўная споведзь. . . . . . . 255

«Полымя» № 4
Издательство «Полымя»
Государственного комитета
Совета Министров БССР
по делам издательств, полиграфии
и книжной торговли
Минск
На белорусском языке

© «Полымя», 1978.

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР Кастусь КІРЭЕНКА.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Яўген Бабосаў, Васіль Барысенка, Пятрусь Броўка, Янка Брыль, Анатоль Вялюгін, Павел Кавалёў, Генадзь Кляўко (намеснік галоўнага рэдактара), Кандрат Крапіва, Іван Пташнікаў, Максім Танк, Іван Шамякін, Рыгор Шкраба.
Адказны сакратар Генадзь Пашкоў.

Нямала песень, паданняў складзена пра матчына сэрца, што поўніцца невымернай любоўю да дзяцей, умее цярпець і даравацъ. Ёсць некалькі паэтычных апрацовак прытчы пра юнака, які ў ахвяру свайму каханню прынёс матчына сэрца... У «Сказе пра матуліна сэрца» К. Кірэенкі даецца творчае абагульненне прытчаў, паданняў, гаворыцца пра подзвігі беларускіх маці, якія абаранялі сваіх дзяцей і родны край:

У гарачае сэрца, у сэрца матулі
Білі бомбы варожыя і варожыя кулі,
І палілі, і ранілі матуліна сэрца,
Каб змаглася матуля, скарылася смерці.
Але ўсё маці вынесла, усё сцярпела —
За сынкоў сваіх мілых, за іх дужасць і смеласць...

«Сказ пра Анастасію Фамінічну Купрыянаву» А. Дзеружынскага іншага плану: у ім рэальная гераіня. Пяць сыноў яна выправіла на вайну і не дачакалася ніводнага: «Стогадовая маці бядуе і не можа сыноў дачакацца, а яны ўсё жывыя ёй сняцца».

У кнігу пра маці ўключаны лепшыя творы. Аднак пракідваюцца і слабаватыя паводле паэтычнага майстэрства, па сіле пачуцця. Складальнік яе, У. Васілевіч, імкнуўся сабраць усё, што адпавядала тэматычна. Аўтары, відаць, не мелі магчымасці перагледзець таго, што было напісана раней. А перагледзеўшы, напэўна А. Наўроцкі не пакінуў бы ў вершы «Маці мая і я» невыразную алегорыю, а М. Гамолка ў вершы «Дома» не напісаў бы: «На свеце больш бяды ужо няма...»

Але не будзем сёння нікога папракаць. У кнізе ёсць галоўнае: шчырасць пачуцця, любоў і адданасць.

Нямала папрацаваў над афармленнем кнігі мастак М. Басалыга. Кніга «Дзень добры, мама!» прыгожа афармлена, добра складзена і выдадзена. Эстэтычнае і выхаваўчае значэнне яе бясспрэчнае. Са старонак яе паўстае велічны, паэтычны вобраз беларускай жанчыны, Маці, працаўніцы і патрыёткі.

**ВАЛЯНЦІНА ЛОКУН**

# ПАВОДЛЕ СТРОГІХ ЗАКОНАЎ

Алесь Жук. Зоркі над палігонам. Аповесць, апавяданні. «Мастацкая літаратура», 1977.

Кожная новая кніга, што выйшла з-пад пяра маладога пісьменніка, заўсёды выклікае ў чытачоў павышаную цікавасць. Ды і крытыкі не абмінаюць яе ўвагаю. І гэта зусім натуральна. Ад пісьменніка чакаюць чагосьці новага — а раптам адкрыццё! На жаль, не заўсёды нашы спадзяванні спраўджваюцца, і найчасцей гэта здараецца таму, што пісьменнік, асабліва малады, забывае пра галоўнае — пра тое, што вельмі дакладна было сфармулявана яшчэ Л. М. Талстым: «Мастак, для таго, каб уздзейнічаць на іншых, павінен быць шукальнікам». Толькі пры гэтай умове твор набывае здольнасць нараджаць у чытача пачуццё суперажывання.

Аўтарам глыбока зацікаўленым, які намагаецца зразумець складаныя працэсы нашага жыцця, паказаў сябе ўжо ў першых сваіх творах Алесь Жук.

Адзін з герояў А. Жука заўважыў, што «жыццё чалавека на зямлі — неверагодна складаная з'ява». Задача мастака ў тым, каб зразумець сутнасць гэтай з'явы, знайсці шляхам мастацкага выяўлення жыццесцвярджальную сілу нашага быцця. Сіла ж гэтая, як сведчыць нядаўна выдадзеная кніга «Зоркі над палігонам», у вернасці свайму абавязку, у глыбокай адданасці справе, якой служыш. У кнігу ўвайшлі аповесць пад гэткаю ж назвай і шэраг апавяданняў, аб'яднаных агульнай тэматыкай, але розных паводле мастацкага ўзроўню. Станаўленне і ўзмужненне характару салдат, кожны з якіх мае свой інтэлектуальны ўзровень, свой тэмперамент, спосаб мыслення; мала-

дыя людзі ў часіны ўскладнёных, не зусім звыклых жыццёвых абставін — ці ўсе яны вытрымаюць выпрабаванні, ці хопіць ім мужнасці пераадолець пэўную перашкоду, звязаную з доляю рызыкі? Галоўнае ж — пераадолець сябе, сваё «я», часам бездапаможнае і баязлівае (Касцюкевіч — «За белым снегам»; Калюгін — «На другой сцяжыне»). Пісьменнік «экзаменуе» сваіх герояў, каб, прайшоўшы выпрабаванне і атрымаўшы перамогу, яны ўсвядомілі сябе сацыяльна значнай асобай, духоўна багатай, з пачуццём грамадзянскай гатоўнасці да подзвігу. Героі А. Жука выходзяць пераможцамі ў духоўным плане, а гэта для іх — галоўнае.

Лейтэнант Карповіч — галоўны герой аповесці «Зоркі над палігонам». Адразу ж пасля заканчэння геаграфічнага факультэта яго прызвалі ў армію. Здавалася, не надта прыемным быў для Карповіча такі паварот, аднак пасля роздуму герой вырашыў, што «служба давала і сваю перавагу: пасля ён мог ехаць не па накіраванні — накіраваць маглі і настаўнікам у школу, — а туды, куды сам захоча, нават і на Паўночны полюс. Хто адмовіцца ад чалавека, які служыў у войску?»

Аднак служба ў арміі — гэта перш за ўсё вучоба, праца, цяжкая, штодзённая, звязаная з небяспекаю, а для афіцэра гэта яшчэ і клопат аб падначаленых, уменне згуртаваць іх у моцную баявую адзінку. І, як выхаваўца, афіцэр павінен быць строгім, патрабавальным, а часам — у залежнасці ад абставін — нават і суровым. Якраз з такім армейскім жыццём, прадыктаваным строгімі законамі, і павінен быў пазнаёміцца лейтэнант Карповіч. Для яго гэта не проста экзамен, а нешта значна большае. Гэтым тлумачыцца і матыў трывогі, што ўрываецца часам у настрой лейтэнанта.

...Прайшло ўсяго два месяцы службы, аднак жа якія гэта былі месяцы! Карповіч спазнаў, што такое бяссонныя ночы, праца да стомы і салдацкая дружба. Жыццё моцна звязала яго і з «баявымі машынамі, і з салдатамі, якія спалі ў дэсантных адсеках... быццам даўным-даўно ён ведае кожнага, быццам нічога больш і не рабіў у жыцці і ні пра што іншае не марыў». Гэта ўжо не той «салага», што любіў пакрасавацца ў люку танка і якому некалі здавалася, што з адыходам на службу «ўсё яго жыццё перавярнулася ўверх нагамі. Цяпер лейтэнант Карповіч мог бясконца, усё жыццё вось гэтак жа стаяць у люку на сваім камандзірскім месцы, гатовы выканаць любую каманду». Праз многія сумненні і трывогі да лейтэнанта прыйшоў сапраўдны гонар, не паказны, а — гонар быць салдатам у самым высокім разуменні гэтага слова.

Імкненне да ідэалу — эстэтычная задача кожнага пісьменніка, задача адказная, вельмі складаная, і вырашаецца яна па-рознаму. Сапраўдная ж удача спадарожнічае пісьменніку ў тым выпадку, калі яго герой, на якога павінны раўняцца іншыя (асабліва моладзь, тыя, што толькі-толькі ўступаюць у жыццё), будзе цалкам рэальнай асобай, «дасягальнай», а не «ўзнесенай» на вельмі высокі пастамент. І ў той жа час мастацкае вырашэнне вобраза героя павінна быць глыбіннае, аб'ёмнае. Пра вобраз Карповіча гэтага, на жаль, сказаць нельга. Ён высвечваецца аўтарам нібы ў адной толькі плоскасці. Сучасны малады афіцэр, да таго ж выпускнік інстытута, ён часам выглядае так наіўна і непрактычна, што гэта выклікае недавер чытача. Мы нічога не ведаем пра яго ранейшае жыццё, у аповесці ёсць толькі кароткая, мімаходзь кінутая інфармацыя пра юнацкую мару зрабіцца падарожнікам. А. Жук не прасочвае працэс узмужнення героя, ён толькі паказвае пачатковую і апошнюю кропкі развіцця характару. Аднак у дадзеным выпадку важны сам працэс. Паставіўшы працяжнік паміж дзвюма стадыямі псіхалагічнага стану лейтэнанта Карповіча, аўтар тым самым прапануе чытачу ўспрымаць напавер шчодра рассыпаныя хвалебныя эпітэты. Ды і словы пра любоў і павагу да Карповіча з боку вышэйшых камандзіраў здаюцца зусім нематываванымі, таму што лагічна не вынікаюць з паво-

дзін героя. Вобраз Карповіча здаецца добра сканструяванай схемай станоўчага героя, афіцэра наогул. І гэта асабліва крыўдна, бо А. Жук — пра гэта сведчаць іншыя яго творы — выдатна валодае майстэрствам псіхалагічнага аналізу, у яго актыве ёсць натуры паўнакроўныя, духоўна багатыя, шматгранныя. Мне могуць запярэчыць, што асноўная мэта аўтара ў аповесці «Зоркі над палігонам» іншая, што для яго галоўнае — паказаць будзённую працу салдата, працэс гэтай працы. У адказ хочацца прывесці хрэстаматыйныя словы пра літаратуру як пра чалавеказнаўства.

Не ўсцярогся А. Жук і ад ілюстрацыйнасці. Аповесць часам падобная на дзённік вайсковых вучэнняў, дзе падзеі занадта дэталізаваныя і, з мастацкага пункту гледжання, неабавязковыя.

Спрактыкаваная рука аўтара ўгадваецца ў апісанні прыроды. Пластычныя, зрокавыя карціны заўсёды «суправаджаюць» герояў, аднак жывуць гэтыя карціны сваім жыццём і да раскрыцця характараў герояў дачынення не маюць.

Багаты ўнутраны свет чалавека, яго сутнасць добра перададзены ў апавяданні «Начны маршрут». Здавалася б, звычайная сітуацыя: радавы Грышкоў, выконваючы вучэбнае заданне, убачыў, што ў лесе загарэўся верас — мог усчацца вялікі пажар. Для таварыша Грышкова, дужага, упэўненага ў сабе Барзова, найважным у той момант здавалася выкананне пастаўленай камандзірам задачы. Грышкоў жа мысліць глыбей, маштабней — найперш ён думае пра тое, каб не дапусціць пажару. Сваю адданасць агульнай справе радавы Грышкоў даказаў не стравой выпраўкай, не выдатнай вучобай — гэта ўсё яшчэ наперадзе, — а нечым іншым, не менш важным. Вобраз радавога Грышкова ў кнізе А. Жука — адзін з лепшых паводле мастацкай завершанасці.

... Служба ў арміі дае чалавеку вельмі многа, яна пакідае ў яго свядомасці глыбокі след — пра гэта яшчэ не ведаюць, не могуць ведаць ні лейтэнант Карповіч, ні радавы Грышкоў, ні механік-вадзіцель Касцюкевіч. Тым не менш кожнаму з іх можна адрасаваць словы з другога апавядання, «За белым снегам»: «была пераадолена галоўная перашкода ў ім самім», пасля чаго з'явілася «невядомая дасюль унутраная сіла». І гэтая «ўнутраная сіла» астаецца ў чалавека назаўсёды, на ўсё жыццё.

У героя ж апавядання «Вяртанне са свайго лесу», эканаміста будаўнічага ўпраўлення Віктара Андрэевіча Моліка, чалавека бясхітраснага і нясмелага, гэтай сілы не стала — і такое ў жыцці здараецца. Але вось праз многа гадоў Молік выпадкова апынуўся ў лесе, у тым лесе, дзе некалі... Думкі, думкі, думкі... А. Жук прыводзіць свайго героя, былога камандзіра мотапяхотнага аддзялення, да важнага адкрыцця: нешта не так атрымалася ў яго жыцці. Ноч, якую прабавіў Молік у лесе ля вогнішча, дакладней — успаміны з армейскага жыцця, якія так востра працялі душу Віктара Андрэевіча, вярнулі яму «адчуванне мужчынскага спакою, упэўненасці ў самім сабе і незалежнасці, чаго ўжо даўно не адчуваў Віктар Андрэевіч...»

Цікава акрэслена сутнасць жыццёвай пазіцыі маёра Іванова, героя апавядання «Развітанне». Вельмі дакладна — праз асобныя дэталі, паводзіны, вонкавае дзеянне — перадаецца яго псіхалагічны стан. Чалавек усё жыццё аставаўся салдатам — ці быў ён у чыне сержанта, лейтэнанта, маёра — менавіта салдатам у самым высокім сэнсе слова. Учора ён развітаўся з палком, а цяпер вось зноў прыйшоў у штаб, завітаў у казарму. «Чаго ён ходзіць?.. На ўсё свой час... Цяпер у яго пачыналася другое жыццё... Другое». А ці ёсць яно, другое жыццё? Не, няма. І не будзе. І ў гэтым таксама ёсць глыбокі сэнс — аставацца самім сабой. У Іванова сваё разуменне жыцця — вучыць салдата, быць пры ім неадступна, нястомна... І ён вучыў салдата быць салдатам.

А. Жук даў глыбокі псіхалагічны партрэт чалавека, высвеціў усё яго жыццё — нялёгкае, складанае,

высакароднае жыццё савецкага афіцэра.

Па-рознаму ўспрымаюць свет героі А. Жука: адны, пераадолеўшы трывогу, з упэўненасцю ўглядаюцца ў будучыню (лейтэнант Карповіч), іншыя яшчэ толькі шукаюць сябе, сваё месца ў жыцці (Грышкоў, Касцюкевіч), трэція, прайшоўшы шлях даўжынёю ў жыццё (маёр Іваноў), з ціхім сумам пакідаюць свой нялёгкі пост.

Імкненне пісьменніка пашырыць свой творчы дыяпазон натуральнае і заканамернае. Праўда, новае не так лёгка даецца, яго трэба заваёўваць. Але нам думаецца, што гэтая задача па сіле Алесю Жуку.

**АНТОН БЯЛЕВІЧ**

✦

# ЗАДУШЭЎНАЯ СПОВЕДЗЬ

Мікола Маляўка. Круг. Вершы. «Мастацкая літаратура», 1977.

Выйшаў зборнік новых вершаў Міколы Маляўкі «Круг». Да гэтага былі тры кніжкі яго вершаў: «Едуць маразы», «Жалеза», «Лотаць», якія засведчылі яшчэ раз, што сапраўдная паэзія не можа быць глухою да жывое справы, да навакольнага жыцця і прыроды, да шчырасці чалавечага сэрца. Чацвёртая — намнога шырэйшая, у ёй яшчэ большыя абсягі навакольнага жыцця.

Зборнік пачынаецца вершамі пра Вялікую Айчынную вайну:

Бацькі за нас ішлі пад кулі,
У мірны час бацькі вучылі:
Змагацца — з сэрцам непадкупным,
Смяяцца з яснымі вачыма.

Даўно адгрымелі баі, даўно пазарасталі травою партызанскія сцежкі ў лясах, даўно падраслі ўнукі франтавікоў, але паэтычны погляд М. Маляўкі скіраваны ў першыя дні вайны. «Я думаю пра тых салдат, якія палі ў сорак першым...»

Праз тужлівыя матывы прабіваецца аптымістычны, мужны настрой:

Спявалі свой партыйны гімн
У час апошні над магілай.
І смерць пад небам дарагім
Была не слабасцю, а сілай...

І нельга яму забыцца таго горкага, пякучага і шчымлівага гора. Над загінуўшымі героямі паэт як бы шэпча словы замовы: «Ну хоць на некалькі мінут уваскрасі іх, дождж вясновы».

І сёння паэту чуюцца з таго далёкага часу то галасы тугі, то — радасці:

Плакалі ў дзень Перамогі
І не хавалі ўсмешкі
Франтавыя дарогі,
Партызанскія сцежкі.

То вялікім гневам, то сардэчнай шчырасцю напаўняюцца струны-радкі верша «Бацьку», які пачынаецца прыказкай: «Жыццё пражыць — не поле перайсці». Водгулле далёкага часу і ў радках шчырага верша — звароту паэта да бацькі: «...сядзяць на покуці твае гады. На панскім полі, бывала, малады, жылы рваў, ад поту слеп — плаціў здароўем за нішчымны хлеб. Не думаў ты, што дарагая плата: сынок малы ў начоўках плакаў».

Усім сэрцам адчуў і выказаў паэт бацькоўскі боль, цяжкую скруху таго далёкага, парабкоўскага жыцця.

Незабыўныя малюнкі маленства ціхай ручаінкаю заплываюць у радкі вельмі шчырага верша пра маці («Крылы»).

Сцежка маленства вяла ў юнацтва, вяла на дарогу сталасці, добрай, натхнёнай працы, што нарадзіла верш «Першы праспект», у якім, «як батарэі, цепляцца каравістыя пні, дзе пілы ад смагі шалеюць. Як ім удосталь папіць? На гарачым жалезе дождж ледзяны аж кіпіць... Хоць скідай і на пілах целагрэйкі сушы... Я не забуду прасеку — першы праспект у жыцці...»

М. Маляўка чуйна ўслухоўваецца ў галасы жыцця. Вясновы